Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem

Цэна асобнага нумару 20 грошаў.

НАШ ГОЛАС

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 7 Вільня, Серада 16-га лютага 1927 г. Год I

На парадку дня.

Урад абвясьціў, што ў найбліжэйшыя месяцы маюць адбыцца нарэшце даўно жданыя перавыбары ў самаўрады,—перадусім у мястовыя. У Пінску ўжо распушчана мястовая рада; тое-ж мае быць і ў Вільні, ды па ўсіх іншых местах, дзе ўжо многа лет уся гаспадарка вядзецца людзьмі, мандаты якіх даўно скончыліся.

Магчыма, што—сьледам за местам—прыйдзе чарод і на вёску. Дык і ў месьце і ў вёсцы беларускія працоўныя масы і працоўная інтэлігенцыя мае перад сабою нязвычайна важнае заданьне.

Ня будзем тут апавядаць гісторыю тварэньня ўсіх гэных „самаўрадаў", якія „выбіраліся" ведамымі ўсім спосабамі ў часы ваенныя, калі народ быў пазбаўлены магчымасьці з'арганізавацца ды ўзяць мяйсцовую гаспадарку ў свае рукі. Што было, тое было. Нас цікавіць цяпер тое, *што павінна быць і што будзе.*

Мы ня ведаем яшчэ точна і тых падставаў, на якіх маюць адбыцца выбары ў самаўрады. Але, незалежна ад таго, на якіх падставах выбары адбудуцца,—ў кожных выбарах прымае ўчасьце *маса*, міліёны людзей, і аб выніках выбарнае кампаніі выращае іменна гэтая самая маса, як бы ні былі ўрэзаны яе правы.

Можам з поўным правам сказаць, што ў сяньняшні мамэнт беларускія працоўныя масы вёскі і места, беларускія сяляне і работнікі—гэта ўжо не распыленыя, нічым ня зьвязаныя паадзінокія жыхары свайго краю, а *сьвядомая і з'арганізованая грамада*, навучыўшаяся супольнымі сіламі рабіць грамадзкую работу. Інстынктыўнае пачуцьцё супольнасьці інтарэсаў усіх працоўных беларусаў было выявілася ўжо і ў часе так-званага „Віленскага Сойму", байкатаванага беларусамі, і ў часе выбараў у Сойм і Сэнат Польшчы ў 1922 годзе, на якія беларусы пайшлі і правялі сваіх лепшых людзей, кіненых цяпер за краты... Але за апошнія пяць гадоў народ, падаўшы свае выбарныя картачкі, не заснуў—да чародных выбараў, а, дзякучы працы сваіх выбранцаў, дзякуючы пасольскім мітынгам і—ўрэшце—дзякуючы арганізацыйнай працы Грамады,—нязвычайна *ўсьведаміўся і вырас сацыяльна.* Усюды па вёсках, мястэчках і местах знайшліся актыўныя працаўнікі і барацьбіты за ідэалы сялянска-работніцкае масы. Усюды аказаліся людзі, здольныя вясьці грамадзкую—культурна-асьветную, нацыянальную і сацыяльную працу. І да новых выбараў—ці то ў самаўрады, ці ў новы Сойм і Сэнат,—беларуская вёска і беларускае працоўнае места пойдуць магутнай сьцяной ужо *зусім сьвядома.*

Выбары ў самаўрады вымагаюць перадусім *добрае арганізацыі на мясцох:* іх з аднаго цэнтру не правядзеш. Мы сяньня гэтую *арганізацыю на мясцох маем* і мусім яе выкарыстаць.

Трэба толькі неадкладаючы, загадзя, распачаць падрыхтоўку сваіх сіл да выбарнае кампаніі, і пад сьцягам сялянска-работніцкае еднасьці мы заваюем самаўрады.

Вываз арыштаваных паслоў і дзеячоў.

Беларускія паслы-грамадаўцы і ўсе культурныя дзеячы, якія былі арыштаваны ўноч з 14 на 15 студзеня і знаходзіліся ў Лукішскім вастрозе ў Вільні,—неўспадзеўні вывезены з Вільні ў вастрог у Вронках, каля Пазнані.

Вронкі—ведамая на ўсю Польшчу вязьніца, у якой варункі прабываньня арыштаваных асабліва нягодныя.

Гэтак арыштаваныя беларускія дзеячы адначасна папалі і ў найгоршую турму і пазбаўлены ўсялякае помачы і апекі з боку сямей, якія насілі ім ежу, бялізну і г. д.

Сярод сямей арыштаваных пануе прост роспач ад сьвядомасьці, што яны ня могуць нічым ужо дапамагчы сваім блізкім.

Пратэсты вёскі.

З розных месц даходзяць весткі аб маніфэстацыях проці арыштаў паслоў Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады. Сьледам за косаўскай дэманстрацыяй, расстралянай паліцыяй, знаходзім у суботнім нумары газэты „Głos Prawdy" карэспандэнцыю, у якой гаворыцца, што „насяленьне ўсяго Горадзенскага павету адгукнулася на арышты паслоў шляхам маніфэстацыяў і дэманстрацыйных паходаў". Такія паходы адбыліся ў вёсцы Галавачы, Скідэльскае гм., і ў вёсцы Масаляны, Вяліка-Эйсмантоўскае гм. У часе паходаў, з'арганізаваных гміннымі камітэтамі Грамады, маніфэстанты пялі „Ад веку мы спалі".

„Dz. Wil." з свайго боку паказуе аб разьвешываньні ў Лідчыне чырвоных сьцягаў і транспарантаў з проці-ўрадавымі надпісамі, у якіх урад Пілсудскага называецца фашыстаўскім. Сьцягі гэткія знойдзены ў Жалудку, Шчучыне, на тракце Ліда-Варанова, у Лідзе, у Ражанцы. Апрача таго параскіданы „антыпаньствовыя" адозвы і газэты „Бальшавік" і „Чырвоны Сьцяг".

Урэшце нас інфармуюць, што па ўсей Заходняй Беларусі началося саматугам зьбіраньне надпісаў на пэтыцыях і трэбаваньнях звальненьня заарыштаваных беларускіх паслоў, кіраваных на імя прэзыдэнта Рэспублікі. Цэлы рад такіх трэбаваньняў, пакрытых блізу тысячай надпісаў з Наваградчыны, ужо высланы поштай на імя прэм'ера Пілсудскага і міністра ўнутраных спраў. Падпісы зьбіраюцца адначасна на двух экзэмплярах, каб адзін захаваць, як доказ і дзеля публікаваньня ў прэсе.

Сарваньне польска-нямецкіх перагавораў.

9 лютага раптам — за 40 мін. да меўшага адбыцца ў Бэрліне паседжаньня нямецкай і польскай дэлегацыяў, якія вялі перагаворы ў справе гандлёвай умовы, — старшыня нямецкай дэлегацыі паведаміў польскага калегу, што паседжаньне ня можа адбыцца, а навет немагчыма азначыць час, калі перагаворы маглі-б узнавіцца...

Польскае агенцтва сьцьвярджае, што спыненьне перагавораў зьявілася зусім неспадзевана для польскай дэлегацыі. Аднак, гэтую неспадзяванку можна было лёгка прадбачыць: сарваньнем перагавораў толькі-што пагражаў у Рэйхстагу павадыр нацыяналістаў гр. Вэстарп, які пачаў іграць вялікую роль у кіраваньні нямецкай палітыкай новага ўраду.

Нямецкі ўрад — праз свайго пасла ў Варшаве—выясьніў прычыну гэтага сарваньня. — Польскі ўрад толькі-што — у часе перагавораў—выслаў з Польскай Сілезіі 4 нямецкіх дырэктараў-чыгуяшчыкаў, — дый яшчэ якраз у часе дыскусіі над агульнай справай аб праве прыезду і пабыту ў Польшчы Нямецкіх грамадзян. Але п. Строньскі ў „Варшавянцы" зусім слушна піша, што гэта — толькі прычэпка, што немцы пачалі вялікую кампанію проці Польшчы наагул, карыстаючыся вельмі выгаднай для Нямеччыны агульнай міжнародна-палітычнай сытуацыяй у Эўропе. — Англія пачала вялізарную ігру на Далёкім Усходзе, што пагражае надоўга затрымаць яе ўвагу і сілы там, адцягнуўшы іх ад эўрапэйскіх падзеяў... Англія шукае сабе сільных прыхільнікаў і саюзьнікаў у Эўропе, якія-б адцягнулі ад Усходу сілы і ўвагу СССР... Англія быццам добра наразумелася ў гэтай справе з Італіяй, якая заявіла ўжо, што будзе актыўна памагаць Англіі ў Кітаі і ў Эўропе, атрымаўшы за гэта—адкрытае абяцаньне Англіі падараваць Італіі нейкія, яшчэ няведамыя, але-ж пэўна, што—чужыя, калёніі... Францыя, якая ня можа зусім справіцца з уласнымі гаспадарчымі клапотамі, страціла ўсялякую актыўнасьць на полі сусьветнай палітыкі, дый перастрашана яўна скіраваным проці яе саюзам Англіі з Італіяй. Гэткім чынам у Нямеччыне, якая падтрымлівае добрыя адносіны з усімі вялікімі дзяржавамі, каб у апошні мамэнт — выбраць спаміж іх, да каго прылучыцца бліжэй — рукі цяпер разьвязаны, і яна можа скіраваць усю сваю энэргію ў бок задачаў першае вагі і патрэбы. Гэтых бліжэйшых задачаў — дзьве: скасаваньне акупацыі і перагляд усходняй граніцы, ці скасаваньне „польскага калідору", які дзеліць Усходнюю Прусію ад рэшты Нямеччыны... Вось якраз дзеля выпаўненьня гэтых дзьвюх чародных задачаў у Нямеччыне і стварыўся актыўны, (каб не сказаць — баявы) урад „Гіндэнбурга — Вэстарпа — Штрэзэмана"...

Дык, паводле п. Строньскага, сарваньне перагавораў з Польшчай — першы крок у распачатай ды шырока закроенай акцыі, — крок, які мае мэтай — дабіць Польшчу эканамічна, каб тым аслабіць яшчэ яе палітычную сілу...

Справа рэформы самаўрадаў.

Ужо больш трох з паловай гадоў ідзе камісійная праца ў Сойме над слаўнымі „кернікавымі законамі" аб „самаўрадзе пана старосты", як у свой час назвала гэтыя праекты беларуская прэса... Гэтыя праекты ляжалі сабе ў камісіі, пакуль некалькі соймавых клюбаў не згаварыліся ўзяцца за справу супольна. Стварылася „супалка клюбаў", так-званая „пяцёрка", якая, узяўшы за падставу тыя-ж „кернікавыя законы", пачала перарабляць іх на падставе ўзаемных уступак і кампрамісаў.

Гэтая супалка складаецца з эндэкаў, хадэкаў, пястоўцаў, вызваленцаў і польскіх сельсаюзьнікаў (Брылёўцаў). І здавалася, што ўсё пойдзе тут проста і гладка.

Яшчэ зусім нядаўна старшыня адміністрацыйнай камісіі п. Путэк заявіў, што паразуменьне дасягнута, кампраміс між клюбамі „пяцёркі" стаўся фактам, і астаецца толькі трэцяе чытаньне, каб скончыць усю працу над самаўрадамі ў Сойме. З другога боку прадстаўнікі міністэрства ўнутр. спраў заявілі старшыні камісіі, што прымуць гарачае ўчасьце ў дыскусіі ў часе трэцяга чытаньня, бо ўрад вельмі зацікаўлены ў тым, каб самаўрадавыя законы ўвайшлі ў жыцьцё чым хутчэй,—каб выбары зрабіць ужо гэтай вясной. Толькі-ж адначасна польскае ўрадавае агенцтва паведаміла паўафіцыяльна, што „ўрадавыя колы маюць некаторыя сумлівы, ці самаўрадавыя законы могуць быць праведзены ў жыцьцё сучасным Соймам"...

Чаму? У чым тут справа?!

Як ведама, рашучым і варожым праціўнікам кампраміснага праекту „пяцёркі" ў камісіі былі і ёсьць „хрысьціянскія абшарнікі" (партыя Строньскага). Але ў першую палову 1926 г. у Сойме ды ў камісіі мала хто з імі лічыўся. Затое-ж ад „траўня", а асабліва—у апошнія часы яўнай ужо перавагі абшарніцкага голасу ў краі і ў урадзе нібы то „мураваны"—соймавы кампраміс у справе самаўрадавых законаў пачаў неяк разваліваццa, асабліва—з правага боку...—Правыя—нацыяналістычныя, буржуазна - зямляўласьніцкія групы, якія раней рабілі некаторыя ўступкі пэпээсаўска-вызваленска-сельсаюзьніцкай лявіцы, пачулі па-за межамі „блёку" і „кампрамісу" больш магутнага цяпер саюзьніка, які галасьней прамаўляў да іх польскага сэрца, асабліва—на „Крэсах", чым навет — „паньствова-творчая" польская лявіца...

І вось, адзін за адным, клюбы і сябры „пяцёркі" пачынаюць рабіць заявы, якія зусім зьніштажаюць надзеі старшыні камісіі п. Путка на ажыцяўленьне кампрамісных праектаў...

Клюб „Пяста", заявіў, што ў часе трэцяга чытаньня падасьць „папраўкі", — якія перадусім касуюць роўнае права голасу для ўсіх грамадзян, уводзячы „дадаткавы голас"— на падставе „падатковага цэнзу"... Апрача гэтай прынцыповай „папраўкі", ламаючай ня толькі законапраект, але і Канстытуцыю, „Пяст" абяцуе рад „паправак" у справе мовы ў самаўрадавых установах (што гэта значыць, хто ж не зразумее?!), аб скасаваньні прапорцыянальнасьці выбараў і г. д...

Хадэкі заявілі, што—у часе трэцяга чытаньня—патрэбуюць або зусім ня ўводзіць самаўрадаў „на Усходзе", або — „увясьці на „Крэсах" асобную польскую курыю (асобныя выбары польскіх выбаршчыкаў), якая павінна выбіраць большасьць складу Радаў (мястовых, а можа і гмінных) пакуль гэтага будзе вымагаць дзяржаўны інтэрас Польшчы"... Што-ж датычыць нейкай там „пяці-хвосткі", (так жартоўна называюць агульнае, роўнае, простае, тайнае і прапорцыянальнае выбарнае права), дык увядзеньне гэткай сыстэмы на „Крэсах" было-б „стварэньнем асяродкаў антыпаньствовай прапаганды і акцыі"! „Гэткая праграма—зусім не сацыялізм, навет — не дэмакратыя, але папросту—нацыянальнае самагубства для Польшчы"... „На крэсах трэба ўвясьці здаровы польскі самаўрад", а ня гэткія нібы-то дэмакратычныя штучкі ды небясьпечныя жарты з „прынцыпамі"... Так зусім ясна піша прэса хадэцыі. (Гл. „Głos Народу" з 2 лютага с. г.).

Што-ж датычыць „найбольш польскай і найбольш дзяржаўнай з усіх польскіх партыяў—Эндэцыі, дык толькі-што — на даклад свайго сябра ў камісіі аб тым, што праекты прыняты ўжо ў другім чытаньні, эндэцкі клюб апублікаваў гэткую пастанову: „Прымаючы да ведама... і лічучы патрэбным канешне правясьці ў гэтую-ж сэсію Сойму самаўрадавыя законы, клюб сьцьвярджае аднак-жа, што праекты гэтых законаў, прынятыя ўжо ў другім чытаньні, — не забясьпечываюць у ўсходніх ваяводзтвах польскага стану валаданьня і дзяржаўнага інтарэсу Польшчы"... Дык сваім прадстаўніком у камісіі і ў „пяцёрцы" эндэцыя дае загад: „не дапусьціць да прыняцьця законаў, калі гэтыя нацыянальныя і дзяржаўныя інтарэсы ў усходніх ваяводзтвах ня будуць забясьпечаны"...

Як бачым, усе тры клюбы правіцы, ствараючыя значную большасьць камісіі і заключаўшыя кампраміс, загадалі сваім прадстаўнікам у камісіі правaліць гэты кампраміс па ўсей лініі. Гэткім чынам правал кампрамісу і законапраектаў у камісіі — забясьпечаны... Але адначасна — паводле „ўставу аб паўнамоцтвах" — урад таксама пазбаўлены права самастойнага выдаваньня законаў у самаўрадавых справах. Дык — калі Сойм, як цьвердзіць урад, ані ўрад, як кажа соймавы закон, — ня маюць магчымасьці ці права вырашыць зацягнуўшуюся справу самаўрадаў у Польшчы, дык — ясна, што — або ўсё астанецца ў тым скандальным стане, які трываў дагэтуль, або — вырашаць справу — міма розных „сумліваў" і фармальнасьцяў — фактычна пануючыя сілы ў краі.

Што-ж мае рабіць у гэтым кірунку ўрад? Мін. Бартэль ясна сказаў, што ўрад мае **скасаваць закон 1922 г.**, які працягнуў на ўсім абшары расейскага забору паўнамоцтвы асабовага складу самаўрадаў, выбраных у першыя выбары — паводле „ардынацыі Морачэвскага", — з тым, каб зараз-жа — паводле гэтай ардынацыі, папраўленай згодна з патрэбамі сёньняшняга дня, — зрабіць новыя выбары — **на ўсім прасторы Польшчы.**

„Гэтая праграма, — закончыў п. міністар, — адпавядае больш-менш якраз „маламу самаўрадаваму закону", унесенаму ў Сойм групай паслоў". — „Каб прысьпяшыць гэтую справу, урад гатовы падтрымаць гэты пасольскі пачын, засьцерагаючы сабе аднак-жа вольную руку адносна да розных дэталяў праекту, асабліва — у справе выбарнай ардынацыі да вясковых гмінаў у Галічыне".

Афіцыяльнае абвяшчэньне разрыву польска-нямецкіх перагавораў.

Нямецкае тэлеграфнае агенцтва апублікавала афіцыяльны камунікат старшыні нямецкай дэлегацыі—у справе перарыву польска-нямецкіх перагавораў. Камунікат гэты кажа, што высылка 4 нямецкіх дырэктараў з Польскай Сілезіі — гэта толькі адна з праяваў сталай сыстэмы польскага ўраду — выцісканьня нямецкіх грамадзян з гаспадарчага жыцьця Польшчы. Калі перасьцярога нямецкага ўраду па адрэсу польскага не падзеяла, нямецкі ўрад пастанавіў спыніць пе-

рагаворы. Можа ў часе перарыву дыпляматычныя прадстаўнікі абедзьвюх дзяржаў здолеюць улагодзіць канфлікт.

„ПАТ", апрача гэтага, паведаміў, што 12 лютага нямецкі габінэт пастанавіў — сарваць перагаворы.

Польская дэлегацыя ў гэтым тыдні мае ўжо вярнуцца ў Варшаву; старшыня польскай дэлегацыі атрымаў загад зьліквідаваць польскую агентуру ў Бэрліне.

У Сойме.

Баявая прамова віцэ-прэм'ера Бартля.

На заканчэньне бюджэтнай дыскусіі (другога чытаньня бюджэту) ў Сойме віцэ-прэм. Бартэль сказаў вельмі характэрную прамову, якая страшэнна абурыла сваім тонам і зьместам ня толькі лявіцу, але і правіцу. Павадыры ўсіх паважнейшых клюбаў Сойму рэзка выказаліся аб гэтай прамове, закідаючы аўтару яе залішнюю самапэўнасьць пры вельмі малым рэчовым зьмесьце прамовы. Закідалі прамове „ўнтар-афіцэрскі тон" у адносінах да Сойму, яўнае жаданьне ўнізіць яго значэньне і павагу, а так сама пахвальбу „сілай трываласьцяй, ды незалежнасьцяй ураду"—у яўнай супярэчнасьці з „істнуючай" у Польшчы Канстытуцыяй.

Відаць, сам аратар спахапіўся, што нагаварыў зашмат,—бо паданы панам „ПАТ'ам" афіцыяльны тэкст прамовы вельмі значна розьніцца ад таго, што слухалі паслы ў Сойме.

У першую чаргу віцэ-старшыня ўраду пярэчыць закідам, быццам урад вядзе барацьбу з парлямантарызмам, разьбіваючы адначасна арганізаваныя сілы грамадзянства ў Краі. Але-ж гэта толькі паны паслы называюць „барацьбой з парлямантарызмам катэгарычную пазіцыю ўраду ў адносінах да Сойму". „Урадавая барацьба з парлямантарызмам істнуе толькі ў фантазіі дый падражненай амбіцыі часткі паслоў!" (голас: і гэта кажа пасол!").

„Аднэй з задачаў ураду было адвучыць Сойм ад яго дрэнных замашак („налогаў") ды—ўзмоцніць уладу ўраду".

„Мы робім усе, каб намейсца бяссільля стварылася ў Польшчы сільная дэмакратычная ўлада". (Голас: „прэсавы дэкрэт")...

„З гэтага шляху урад ня зыйдзе, адкідаючы адначасна закід — барацьбы з парлямантарызмам і таптаньня Сойму", бо „гэткія... выражэньні—вельмі шкодзяць Польшчы, як унутры, таксама і заграніцай". „Вельмі шкадліва з таго-ж пагляду гутарка, быццам паўнамоцтвы п. Прэзыдэнта—нерэальныя". Наадварот—„ня было яшчэ ў Польшчы ўраду больш скромнага ў сваіх заявах, як нашы"... (агульны сьмех).

„Мы лічым сябе за Урад Працы. Наш урад—першы запраўды-ж нармальны ўрад у Польшчы, які мае пачуцьцё сваей годнасьці, для якога соймавая камісіі не зьяўляецца беспасрэдным начальствам". Кажучы далей аб закідах — надужыцьцяў у асабовых зьменах адміністрацыі, п. мін. заяўляе, што гэта чыстка ад „падкупленых партыямі і бюракратычных элемэнтаў", — але гэта толькі яшчэ пачатак таго, што мае наступіць далей"... (страшэнны гвалт на правіцы).

„Закід у мілітарызацыі адміністрацыі — ўжо зусім гумарыстычны. Апрача марш. Пілсудскага, ня толькі я сам быў афіцэрам: афіцэрамі былі ў часе вайны п. п. міністры Морачэўскі, Станевіч, Ромоцкі, Медзінскі, Квятковскі, Добруцкі (Голас: „Воевудзкі!"). Дык зьвяртаю ўвагу Сойму на гэткае небясьпечнае зьмілітарызаваньне ўсей Рады Міністраў" (Сьмех на лявіцы).

У частцы, ахвяраванай замежнай палітыцы, прадстаўнік ураду сцьвярдзіў мірную палітыку Польшчы адносна да СССР, запярэчыўшы чуткам аб рыхтаваньнях да канфлікту з савецкім урадам, аб чым пішуць радавыя газэты. Выразіў жаль з прычыны сарваньня гарговых перагавораў з Нямеччынай, за што віну узлажыў, зразумела-ж, на нямецкі ўрад.

Значную частку прамовы ахвяраваў справе самаўрадавых законаў, аб чым мы далі асобны артыкул.

У справе „ўсходня-крэсавай палітыкі", віцэ-прэм. заявіў, што Сойм шмат гутарыў аб пануючай быццам дагэтуль на „крэсах" самаволі ды ўціску з боку адміністрацыі. „Урад зьменамі асабовага складу адміністрацыі на „крэсах" мае ўвясьці там роўныя адносіны да ўсіх грамадзян бяз розьніцы нацыянальнасьці, як гэтага вымагае Канстытуцыя". „Дык ясна, што ўрад ня зьбіраецца выдзяляць наагул справу меншасьцяў у нейкае асобнае пытаньне, а так сама — тварыць дзеля таго нейкія асобныя ўстановы ці „віцэ-міністра" для спэцыяльнага адміністраваньня ў меншасьцявых справах".

Вось усе, што п. міністар мае ў праграме для меншасьцяў.

У канцы, пасьля агляду „гаспадарчай стабілізацыі ў Польшчы", віцэ прэм'ер асабліва сільна падчыркнуў „сілу, трываласьць і незалежнасьць сучаснага ўраду, якія мо' зьяўляюцца найважнейшымі нашымі здабычамі і найсільнейшай падставай для лепшай будучыны Краю"... „Сіла" ўраду, які „адвучыў" парлямант ад яго „дрэнных сувэрэнных замашак" ды звычаяў, праўда, прадугледжаных у § 1 Польскай Канстытуцыі; „трываласьць ураду", якога фактычна ня здолее скінуць Сойм, калі навет выразіць яму недаверые; і „незалежнасьць ураду" ад бяссільнага парляманту — вось, што найбольш радуе віцэ-старшыню гэтага ўраду...

У Польшчы.

Урадавая партыя разваліваецца далей.

10 га лютага, вярнуўшыся ў Варшаву, дзе ня быў апошні час, пасол Сьмяроўскі, ведамы варшаўскі адвакат, падаў у „Клюб Працы" заяву аб выхадзе з яго. Матыў—становішча клюбу ў справе выдачы беларускіх паслоў.

Пэўна-ж, ніводзін запраўдны юрыст ня можа прылажыць сваю руку да сьцверджаньня згары „паважнасьці абвінавачаньня" паслоў у тым, што яны — „дышалі шпіёнскай атмасфэрай", як фармулаваў абвіненьне мін. справядлівасьці Мэйштовіч. Дый вось толькі-што выкрылася на нашых „крэсах" запраўдная шпіёнская афэра, але да яе ніхто з паслоў ня мае, зразумела, ніякага адношаньня.

Заграніцай.

Англійскія работнікі ў справе амністыі ў Польшчы.

У Лёндансіх газатах апублікавана адозва павадыроў англійскіх работнікаў (Партыі Працы) да прэзыдэнта Польшчы Мосьціцкага і марш. Пілсудскага, у якой падпісаўшыяся дамагаюцца амністыі для палітычных вязьняў у Польшчы.

Далейшыя гвалты літоўскага ўраду.

Фашыстаўскі ўрад у Коўні далей граміць апазіцыю, не разьбіраючы ўжо—сацыялістаў, ці камуністаў. 10-га лютага, напрыклад, арыштавалі яшчэ два дзесяткі людзей, абвінавачаных у—„камунізьме".

Выкрыцьце фашыстаўскай арганізацыі ў Латвіі.

У сувязі з арыштаваньнем некалькіх сяброў латвійскай нацыяналістычнай партыі з знойдзеных пры вобысках дакумэнтаў выявілася падрыхтаваньне замаху на істнуючы лад—сьледам за Літвой.

З 13 асобаў, у якіх зроблены вобыскі, арыштаваны толькі 3. Знойдзена карэспандэнцыя з італьянскімі фашыстаўскімі інструкцыямі, і з іншымі латвійскімі „народовымі" партыямі, дзе гаворыцца аб стварэньні адзінага фронту. Апрача ўсяго гэтага, знойдзена шмат камуністычнай літэратуры. Гэта апошняе—найбольш цікаўна: пэўна-ж, гэтая „камуністычная" літэратура, відаць, — асабліва правакацыйнага зьместу, друкавалася зумысьля ў фашыстаўскіх друкарнях і раскідалася, каб адвярнуць увагу ўлады ад падрыхтаваньняў фашыстаў, а нацкаваць на — камуністаў, ад якіх быццам ідзе найвялікшая небясьпека замаху.

Ці ж гэта толькі ў Латвіі тасуюць гэткую тактыку фашысты?! Пэўна-ж італьянскія інструктары, добра апрацаваўшы дома ўсе спосабы захвату ўлады, выкладаюць аднолькава сваю „навуку" ўсім сваім вучням.

Міністар-замаховец у складзе нямецкага ўраду.

Здэецца, сьледзтва ў справе новага міністра ўнутраных спраў, якога апазіцыя вінаваціць у падрыхтаваньні слаўнага каппаўскага замаху на рэспубліканскі лад у Нямеччыне, яшчэ ня скончана, а вось большасьць Рэйхстагу ўжо выразіла яму сваё поўнае даверые, адкінуўшы большасьцю 217 галасоў проці 161 прапэзіцыі дэмакратаў, сацыял-дэмакратаў і камуністаў—аб недаверыі.

Рэзкі паварот Італіі проці СССР.

Яшчэ нядаўна намячалася пэўнае зблыжэньне на міжнародавым груньце між Італіяй і СССР. Пасрэднікам між імі была Нямеччына. Асьцярожная палітыка Італіі, ня прызнаўшая за Румыніяй Бэсарабіі, значна аблягчыла гэтае збліжэньне, якое абедзьве дзяржавы маглі выкарыстаць для сябе вельмі добра. Але вось англійскі міністар Чэрчыль паехаў у Рым, даў Мусоліні пазыку, ды абяцаў аддаць французскія калёніі, каб толькі той памог яму — задушыць вызвольны рух у Кітаі, адначасна прыняўшы ўчасьце ў плянаваным, як пішуць цяпер ясна, находзе на СССР.

Што там будзе з усяго гэтага далей, пабачым. Але вось радавая прэса сцьвярджае, што—ад гэтага пабыту Чэрчыля ў Рыме курс італьянскай палітыкі адносна-ж СССР рэзка зьмяніўся.

Новы загад кантонскага ўраду.

Кантонскі ўрад зусім не спалохаўся пагрозаў англійскіх імпэрыялістаў і іх таварышоў. У адказ на трэбаваньне „экстэрытарыяльнасьці" (нятыкальнасьці для краёвых уладаў, непадсуднасьці кітайскім судом, і г. д.) чужаземцаў, ды іх канцэсіяў і кварталаў кантонскі ўрад абвясьціў новы закон, касуючы навет дагэтуль істнаваўшыя мяшаныя

Што было у Партугаліі.

Крыху высьвятліліся цяпер прычыны і характар толькі-што здушанай новай партугальскай рэвалюцыі.

У выніку апошняга ваеннага перавароту ў Партугаліі запанавала — таксама, як у радзе іншых краёў, асабліва — у падлягаючых уплывам Англіі — ваенная дыктатура ген. Кармоны. Ген. Кармона, як гэта здарылася і дзе-інш, захапіў уладу і пры падтрыманьні Англіі. Дыктатар і ў Партугаліі пачаў рабіць тое, што яго калегі рабілі, ды робяць у „сваіх" краёх: падняў „бат" над парлямантам, садзіў усюды сваіх людзей, душыў прэсу, аддаў на ласку буйных уласьнікаў працоўнае насяленьне краю, ды верна служыў інтарэсам банкіраў ды скупшчыкаў краёвага віна і сыр'я.

Тады проці дыктатара пачаў бурыцца народ. З гэтага хваляваньня народу скарысталі больш дэмакратычныя афіцэры арміі, якія — разам, з групай паслоў парляманту паднялі паўстаньне. Паўстаньне адразу ахапіла ўсю паўночную палову Краю. На чале паўстанцаў, пераважна вайсковых часьцей, сталі ген. Суза, Дыяз, Мюррай, палкоўнік Мондоройс і інш. Штаб паўстанцаў выдаў адозву, у якой паставіў ураду ультыматум: у 24 гадз. зрачыся ўлады. Урад на гэта адказаў абвяшчэньнем асаднага палажэньня на ўсім прасторы краю. Але загады ўраду адразу неяк страцілі сілу ў краі. Урадавыя войскі пачалі пераходзіць на бок паўстанцаў. Так, начальнік дывізіі ў Опорто ген. Гомэц з усей дывізіяй далучыўся да паўстанцаў. Перакінулася паўстаньне ў паўдзённую палову краю. Урэшце, выбух ваенны бунт, а пасьля і работніцкая рэвллюцыя ў сталіцы. Магутны партугальскі флёт стаў рашуча на бок паўстанцаў.

Буржуазная дэмакратыя дамагалася „адбудовы канстытуцыі", спыненьня дыктатуры, стварэньня нацыянальнага ўраду. Працоўныя, як заўсёды, ішлі значна далей... Чыгуншчыкі пастанавілі абвясьціць агульную забастоўку.

Урадавае войска з апошніх сілаў пачало бараніць свае шляхі камунікацыі, але — ведама-ж, — ня вытрымала-б барацьбы з усім народам. Уся прэса ў краю і па-за краем сьцвярджала ўжо перамогу паўстаньня на ўсей лініі... — Ішлі весткі аб стварэньні ўжо новага ўраду, аб арышце міністраў старога дый — самага прэзыдэнта...

Раптам сталася нешта „неспадзяванае". Што і як здарылася, даведаемся пэўна-ж пасьля. Цяпер можна сьцвярдзіць толькі, што раптам нейкім пудам у барацьбе зрабіўся рэзкі паварот — на карысьць урадавых войскаў, якіх справа была ўжо яўна безнадзейная... У выніку гэтага „цудоўнага пералому" армія паўстанцаў разьбіта, галоўныя іх павадыры ўзяты ў палон, „бунт" у сталіцы задушаны, і ўлада дыктатара ізноў адбудавана, як была да рэвалюцыі.

У выніку „паражэньня" паўстанцаў усе іх высілкі — вызваліць край ад самаволі англійскага найміта, усе страшэнныя ахвяры людзьмі і дабром краю — прапалі дарма.

Што ж сталася такое, што так цудоўна адратавала жыцьцё і ўладу ненавістнага для народу дыктатара дый яго ўраду? Ізноў, — падрабязна даведамся калісьці. Цяпер — з тэлеграмаў — падамо толькі невялічкую вестачку аб тым, што — якраз у крытычны для прыхільнага ді Англіі ўраду дыктатара Кармоны мамэнт (8 лютага) — з Гибралтару *) прыбылі ў партугальскія порты „дзеля абароны англійскіх інтарэсаў" некалькі англійскіх ваенных караблёў. А як добра ўмеюць англійцы „бараніць свае інтарэсы", мы ведаем на прыкладах: Кітаю, Літвы і шмат іншых.

*) Гібралтар — сільная англійская крэпасьць на паўдні Гішпаніі.

Ляо-Дзэ.

На берагох Янг-Тэз-К'янгу.

(Апавяданьне з сучаснага кітайскага жыцьця).

Пасьля бурлівага дня стары Гян'-янг анямеў і заснуў. Сьпяць пасьля цяжкай працы ў доках белых кулі, сьпяць работнікі з вялічэзных сталёвых гут, што быццам агнёвыя драконы, як дзень, так ноч, шыпяць, сапуць і плююцца цэлымі вулканамі іскраў на беразе самай ракі Янг-Тэз-К'янгу.

Час ад часу, ступаючы цяжка па ліпкай гразі вуліцы, пройдзе апрануты ў вопратку барадатых белых людзей, начны сторож, ды ў тым ці іншым панадворку жаласна адзыўнецца сабака.

У аднэй невялічкай і чуць жывой хаце паўночнай акраіны Ган'ягу, скрыпнулі дзьверы, і на парозе паказаўся нявысокі, скуласты, шыракаплечы мужчына гадоў трыццацёх пяцёх. Косыя яго вочы былі поўны агню і рашучасьці; ён агляНуўся па вуліцы, падняў полы свайго ватавага даўгога адзеньня і, стараючыся быць незаўважаным і нячутным, скіраваўся на ўсход к берагу Янг-Тэз-К'янгу.

Крадучыся ад сьцяны да сьцяны, рознымі закавулкамі і сьцежкамі дабраўся ён да старога шырокага мястовага муру і праз вылам, зроблены ў ім гарматамі белых у часе гэраічнага паўстаньня „Вялікіх кулакоў" проціў хітрых белых прыблудаў, — выйшаў на бераг ракі. Тут ён яшчэ раз аглянуўся, пільна ўважаючы, ці за ім хтось ня сочыць.

Пуста і ціха было, аднак, усё кругом. Толькі шырокі мнагаводны Янг-Тэз-К'янг спакойна і вялічава каціў свае воды на поўнач, каб дзесьці за Ганкаў зьвярнуцца на ўсход і, прабегшы па густа населеным краю яшчэ з тысячу кілямэтраў, сплзнуць у бясканечным моры. На правым беразе ракі раскінуўся Вучанг.

— „Стары Тао спрыяе справе бедных сыноў нашай зямлі"—прагаварыў сам сабе таямнічы гэты чалавек.

Цяпер раптам сярод гэтай начной цішыні пачуўся праразьлівы крык ката; у адказ яму далей троху на паўдзень пракрычэла жаласна тры разы сава. Кот мяўкнуў ізноў, але значна цішэй.

— „Хто і ў імя чаго сьмее трывожыць сон дракона"?—спытаўся яго, вырасшы раптам быццам з пад зямлі, невялікага росту храмы кітаец, аскаліў свае белыя зубы і, як вар'ят, засьмяяўся і закруціўся.

— „Імем сыноў зямлі і неба, я Тсай-Ван-Тсун іду ў Вучанг; памажы мне пераехаць Янг-Тэз-К'янг".

— „О, Тао, вярхоўны розум і найвышэйшы закон"!..—прагаварыў радасна храмы, і дурнасьць яго адразу кудысь зьнікла. „Такі-ж нас не ашукалі, а цябе, наш дарагі Тсай-Ван-Тсун, наша зямля зьберагла для нас, крыўджаных і задушаных барадатымі сабакамі і іх подлымі слугамі... Лодка мая тут недалёка, ідзём і едзем скарэй у Вучанг: там ужо даўно напэўна чакаюць цябе". .

Тсай-Ван-Тсун не адказаў на гэта ні слова. Ён моўчкі сеў у невялічкую лодку і здаўся на ласку свайго праваднiка. Храмы лоўка сапхнуў лодку з мясчанага берагу і, ня гледзячы на сваю хворую нагу, з спрытнасьцю ката саскочыў у яе сам.

Ціха плёснулі вёслы па вадзе; лодка затраслася, закалыхалася і, павярнуўшыся кругом, шыбка панеслася па люстранай вадзе старога Янг-Тэз-К'янгу.

Чым далей адплывала лодка ад левага берагу ракі, тым начны абраз станавіўся больш маляўнічым. Сталялітныя гуты выкідывалі цэлыя вулканы іскраў, на поўнач абапал ракі Гана значылася сваімі маленькімі аганькамі кітайская часьць места Ганкаў; а там яшчэ далей, над самымі водамі Янг-Тэз-К'янгу, пылалі залітыя сьвятлом канцэсіі эўрапейцаў. Перад імі калыхаліся на водах ярка асьветленыя вялізарныя параходы.

Ван-Тсун глядзеў на гэтыя агні і сам загараўся якімсьці дзікім агнём.

— „О, подлыя, ненасытныя крывапійцы"!.. прамовіў ён ціха праз зубы сам да сябе.—„Вам мала крыві і поту народаў Эўропы, Афрыкі, Амэрыкі і Аўстраліі?!. Прыйшлі вы і сюды—па кроў і працу нашага працавітага народу... Але не, годзе ўжо вам!... Кітай наш прачнуўся і больш не засьне... Дарэмна траціце вы грошы на разных нашых здрайцаў, дарэмна пасылаеце сюды свае параходы і гарматы: ваш прыгон над намі ўжо ня ўтрымаеце імі"!..

І Ван-Тсун, як сталёвая пружына, падняўся і выпраставаўся на лодцы ў увесь свой рост.

— „Сядзь, дружа, лепш: стоячы ехаць небясьпечна: могуць лёгка прымеціць нас з берагу, ды і перакуліцца ня штука", — прагаварыў храмы.

Ван-Тсун цяжка ўздыхнуў, сеў і задумаўся, успамінаючы сваю прошласьць.

— — — — — — — — — — —

Ён быў адзіным сынам мандарына, правіўшага ад імя імпэратара Кітаю Шанхаем і яго правінцыяй. Па абычаю багатых і знатных кітайцаў, пачаў ён вучыцца яшчэ з дзяцінных гадоў. Навука яму давалася лёгка, цікавасьць ён меў вялікую, а стараннасьць яшчэ большую.

Юнак Ван-Тсун здаў скора патрэбныя на права мандарына акзамены; усе знаёмыя і прыяцелі яго бацькі цяпер ужо былі пэўны, што ён скора падобна бацьку займе важнае месца ў імпэрыі, і прарочылі яму слаўную кар'еру.

Аднак Ван-Тсун к вялікаму жалю бацькі, замест жаніцца і быць мандарынам, ізноў узяўся за тоўстыя кніжкі.

Дзіўным здалося гэта ўсё кітайскай знаці, але для Ван-Тсуна ўсё было проста і ясна.

„Нікому не рабі благога і ніколі не ганіся за дабром іншых"!—Чытаў ён у старой кнізе Шы-Кінг. „Не рабіце тое людзям, чаго вы ня хочаце, каб рабілі вам людзі".—чытаў ён у вялікага вучыцеля Канфуцыя.

— „Кітай і кітайцы засталіся верныя гэтым правілам сваіх вялікіх вучыцялёў і філёзафаў. Мы не хацелі вайны, бо—„Вайна ёсьць найбольшае зло"; а што сталася з нашым народам"?.. задаваў сабе пытаньне юнак, чытаючы тоўстыя кнігі, век якіх сягаў ня раз за тры тысячы год.

І кожны раз, як маладому Ван-Тсуну прыходзілі на памяць гэтыя пытаньні, ён успамінаў усе тыя нялюдзкія паняверкі, якія прыходзілася кітайцам знасіць у сваей уласнай зямлі ад абдораных правам нятыкальнасьці хітрых бяздушных чужынцаў.

І цяпер, гледзячы на залітыя сьвятлом канцэсіі англічан і французаў у Ганкаў, узьбег яму на памяць выпадак, які стаўся рашаючым у ўсім ягоным жыцьці.

Раз ішоў ён пад даглядам свайго вучыцеля па рынку ў Шанхаі. Дзень быў таргові. Якісьці хлопчык да таго залюбаваўся рознымі таварамі, што забыўся аб усім на сьвеце. У гэты час наляцеў адкульсьці і наткнуўся на яго ангельскі афіцэр.

— „З дарогі, парасё паршывае"!.. крыкнуў ён сіпла паангельску. „Я вас, жаўтарылых, навучу, як шанаваць афіцэраў флёту яго вялічаства караля Брытаніі"!..

Сьвіснула ў паветры тросьць; хлопчык крыкнуў, схваціўся рукой за сваю шыю і асунуўся на зямлю. Аднак, афіцэр „яго вялічаства" ахвяры сваей ня кінуў: за адным ударам пасыпаліся другі, трэцьці...

Гэтага зьдзеку толькі-што пераджыўшыя гэраічнае паўстаньне „Вялікіх кулакоў" кітайцы зьнясьці спакойна не маглі, і хто з чым папала—кінуліся да ангельца.

Кепска-б прышлося нахальнаму ангельцу ад гневу самога бога, *) але на ратунак к яму кінулася кітайская паліцыя. Яна ўзяла яго пад сваю ахову, разагнала тлум і, нізка кланяючыся і прысядаючы, упрасіла ангельца ісьці ў Брытанскую канцэсію, па дарозе куды берагла яго, як сьвятога.

— „Чаму паліцыя не затрымала гэтага

*) У адной з веранавук кітайскай кнігі Шы-Кінг сказана: „Воля неба выказываецца народам".

Эміграцыя з Польшчы.

У працягу толькі першай паловы 1926 г. выэміґравала (выехала ці высялілася) з Польшчы ўсяго 110 тысяч 378 асоб. З гэтай лічбы 27,037 душ высялілася за акіян, каля паловы якіх (47%)—безработныя. У Злучаныя Штаты выехалі 3,207, у Канаду — 9,701, у Бразілію—1,371, у Аргентыну—6,569, у Палестыну — 5,207, у рэшту заморскіх краёў—892.

У эўрапэйскія краі за той-жа час высялілася з Польшчы 83,341 душ; з іх 87%—безработныя, шукаючыя працы, якой не знайшлі дома. З іх у Нямеччыну выехала 40,927, у Францыю—39,561, у Данію — 997, у Бэльгію—887, Румынію—396, у інш. краі Эўропы—563.

Цікаўна параўнаваць лічбы эміґрацыі апошніх гадоў.

У папярэдніх гадох—у першыя паловы іх—за акіян эміґравала з Польшчы нябольш 10—20 тысяч. У 1926 г.—ўжо больш як 27 тысяч. Яшчэ больш узрасла эміґрацыя ў эўрапэйскія краі. У папярэдніх 4-х паўгодзьдзях эміґравала з Польшчы ад 18 да 28 тысяч; у 1926 г.—83 тыс.

Зьмяніўся значна нацыянальны склад эміґрацыі. З прычыны забароны вольнага прыезду ў Злучаныя Штаты і эканамічнага крызісу ў Палестыне, значна паменшала лічба эміґрантаў-жыдоў; адначасна яшчэ больш узрасла лічба палякоў. Аднак-жа ўсьцяж яшчэ лічба эміґрантаў-жыдоў перавышае лічбу палякоў і ўкраінцаў. За тое ў эміґрацыі ў Эўропу жыдоў было толькі 2 проц., палякоў—82,6 проц., рэшта—ўкраінцы і беларусы.

Па сацыяльнаму складу сярод эміґрантаў — найбольш сялян-хлебаробаў: у заморскай эміґрацыі—88 проц., у эўрапэйскай—71 проц.; прамысловых работнікаў і вуглякопаў—у першай 10 проц., у другой—21 проц.

З гэтага відаць, што безработны працоўны народ, ня маючы заробку, усё больш уцякае з краю. Афіцыяльна зарэгістраваных безработных у местах лічыцца 350 тыс. А ўсяго ў месьце і на вёсцы пэўна-ж больш мільёну, бо аблічаюць на мільён толькі безработных на вёсцы.

Пералюдненьне вёскі —пры беззямельлі шырокіх масаў працоўных хлебаробаў дый пры сталым прамысловым крызісе ў месьце, якое ня можа прымаць да сябе лішку вясковага насяленьня,—пагражае Польшчы вялікімі ўстрасеньнямі. Ня трэба забывацца, што ў Польшчы штогодна прыбывае па паўмільёна душ натуральнага прыросту насяленьня. А мейсца для іх—для гэтых новых—ня толькі не прыгатавана, але робіцца зацесна і для ўсіх старых... Дык адзіны шлях ды спосаб для ўраду ўтрымаць „сацыяльную раўнавагу“ ў краі—гэта кіраваць народ па-за межы роднага краю...

Але і гэты „спосаб дзяржаўнай гаспадаркі „хутка будзе зачынены зусім для Польшчы. Ужо эміґрацыя ў Амэрыку вельмі значна абмяжавана, амаль ня спынена: польская „квота“ зусім малая; безрабоцьце ў Нямеччыне ды завастрэньне гаспадарчай вайны з Польшчай могуць зачыніць граніцу для польскай эміґрацыі ў Нямеччыну, якая дае найбольшы рынак для „чалавечага вывазу“ з Польшчы. Так сама і Францыя: падымаючы сваю валюту. Францыя ўсе больш уваходзіць у сталы прамысловы крызіс, які выклікае ўсё ўзрастаючае безрабоцьце, якога там дагэтуль зусім ня было. Дык у выніку гэтага і францускі рынак будзе зачынены для „вывазу працы“ з Польшчы...

суды. Адгэтуль чужаземцы павінны будуць падпарадкавацца выключна агульным для ўсіх жыхароў кітайскім судом, у якіх ня будзе навет чужаземных „асэсараў“.

Пэкінскі ўрад—проці Англіі.

Як даліся ў знакі кітайцам англійцы, даводзіць ня толькі сьмяротная барацьба з імі—„бальшавіцкага“ чырвонага Кантону, але і вострая акцыя проці іх пакорнага буржуазнага Пэкінскага ўраду. Толькі-што Пэкінскі ўрад пастанавіў не зьвяртаць увагі на пратэст дзяржаў проці звальненьня Пэкінам англійскага „мытнага камісара“ Аглона, а калі яго наступнік таксама ня будзе слухаць кітайскіх уладаў, дык — звольніць і таго. Што-ж датычыць англійскага мэмарыялу — з англійскімі прапазіцыямі ў справе паразуменьня, дык і пэкінскі ўрад, як і кантонскі, заявіў, што пакіне гэты мэмарыял без адказу, пакуль на кітайскай зямлі будуць стаяць англійскія войскі. Пэкінскі ўрад адкінуў таксама і амэрыканскую прапазіцыю аб нэйтралізацыі Шанхаю.

І Чанг-Тсо-Лін—„за сувэрэннасьць Кітаю“.

Выступіўшы ў паход проці чырвонага Кантону, Чанг-Тсо-Лін выпусьціў маніфэст да кітайскага народу, у якім заяўляе, што яго галоўная задача — „абарона сувэрэнных правоў (незалежнасьці) Кітайскай дзяржавы“ (толькі — пад японскім ботам ды за англійскую „пазыку“). Маніфэст перасьцерагае кітайскі народ ад залішне радыкальнага чырвонага Кітаю, які завядзе Кітай у страшэнную біду (пазбавіўшы апякуноў-дабрадзеяў!). У канцы дыктатар Паўночнага Кітаю кажа, што вядзе вайну (за японскія грошы!) толькі з „камунізмам, але ня з кітайскім народам“, дый што „можа згаварыцца з усялякай уладай у Кітаі, апрача—бальшавіцкай“.

Пэўна-ж: бо ўжо згаварыўся—з японскай і англійскай!

Як гэта зразумела для нас, беларусаў!

Канфэрэнцыя II Інтэрнацыяналу.

12-га лютага мела адбыцца ў Парыжу канфэрэнцыя Выканаўчага Камітэту II (сацыялістычнага) Інтэрнацыяналу. На чарзе дня—паміж іншым — справа аб мерах проці маючай распачацца імпэрыялістычнай бойні ў Кітаі.

Як ведама, гэны самы II Інтэрнацыянал у пачатку сусьветнае вайны нічога не зрабіў, каб спыніць бойню ў Эўропе. Дык дзе ўжо там ён што зробе ў далёкай Азіі!

Да падпішчыкаў.

Просім усіх тых паважаных падпішчыкаў, каторыя маюць які-колечы інтарэс у адміністрацыі нашае газэты, прытрымлівацца гэтых правілаў.

1) Падпісную плату перасылаць беспасрэдна ў адміністрацыю з паказаньнем падробнага адрасу падпішчыка, а калі разам прысылаецца ад некалькіх падпішчыкаў, дык адрас кожнага падпішчыка і колькі ад каго грошы.

2) Пры ўсялякай перапісцы падаваць свой дакладны адрас, абавязкова з паказаньнем тае пошты, з каторае атрымліваеце газэту.

3) Пры перамене адрасу падаваць дакладна абодва адрасы — стары і новы, або: каму спыняецца і хто будзе атрымліваць надалей.

Хроніка.

Да ведама ўсіх сяброў Т-ва Беларускае Школы, пражываючых у Вільні. Цэнтральны Гурток Т-ва Беларускае Школы ў Вільні арганізуе **вялікі беларускі хор**, пад кіраўніцтвам гр. Шырмы. Абавязак усіх сяброў Т-ва, пражываючых у Вільні і могучых пяяць, прыняць жывы ўдзел у гэтай справе і зьяўляцца ў назначаны час на сьпеўкі. Сьпеўкі будуць адбывацца ў салі Народнага Дому пры Віленск. Цэнтр. Гуртку Т-ва Белар. Школы (вул. Сьв. Ганны 2) кожную сераду і Пятніцу ад 6 гадз. вечара.

Популярныя лекцыі. У апошнюю суботу, згодна з запаведзяй, адбылася ў Цэнтральным Гуртку Т-ва Беларускае Школы ў Вільні лекцыя грам. В. Грышкевіча на тэму **„Проблема свабоды волі“**. Даступны выклад гэтае зложнае проблемы з адзначэньнем галоўных кірункаў філёзофічнае мысьлі ў гэтым пытаньні зусім здаволіў чысьленую публіку, сабраўшуюся паслухаць маладога лектара, першы раз публічна выступаўшага перад нашым грамадзянствам.

У найбліжэйшую суботу, 19 лютага, у 7 гадзіне ўвечары прачытае ў памяшчэньні Гуртка (вул. сьв. Анны 2) лекцыю: **„Эвалюцыя Творчасьці Янкі Купалы“** д-р Ігнат Дварчанін.

Пінскі аддзел Бел. Каап. Банку, як нас паведамляюць, ня глядзячы на арышт яго кіраўніка грам. Васілеўскага, вядзе сваю працу зусім нармальна.

Гэтак брахня польскае прэсы ня толькі аб „ліквідацыі“ аддзелаў, але і віленскае Цэнтралі, разьвеялася аканчальна: і Цэнтраля, і абодва аддзелы—Пінскі і Глыбоцкі — вядуць далей сваю карысную працу, ня глядзячы на перажытыя ўдары і зробленыя арыштамі страты.

Перасьцярога. Як даведалася „Бел. Кр.“, па вёсках езьдзяць польскія агенты—з „Мацежы Школьнай“ і інш., якія рознымі баламуцтвамі стараюцца вырваць подпісы сялян, што ня хочуць беларускае школы, а просяць польскае.

Гэтых баламутаў, хоць-бы яны страшылі паліцыяй і карамі, трэба сустракаць так, як яны на тое заслугуюць.

Канфіскацыя беларускіх газэт трывае. У апошніх часох пачалася арганізацыя розных цёмных фігур спаміж былых беларускіх дзеячоў, пайшоўшых на службу ў дэфэнзыву. Арганізацыя гэная выступае нібы то пад сьцягам „незалежнасьці“ Беларусі, якую быццам мае даць нам... Польшча!

Відаць, прыняўшы весткі аб гэтым за чыстую манэту, „Сялянская Ніва“ папробавала паважна загаварыць аб незалежніцкіх ідэалах. Ну, вынік гэтага—ясны: гутарыць аб незалежнасьці ў маленечкім кружку людзей,—гэта адно, а паўтараць публічна перад шырокімі масамі—другое,—дык віленскія ўлады і пачалі канфіскаваць „Сялянскую Ніву“, якое да „ліквідацыі Грамады“ зусім не чапалі. Надовячы сканфіскаваны № 14 газэты—ўжо трэці з чароду.

Тое, аб чым гаварылася ў папярэднім нумары нашае газэты—ў перадавіцы, зьдзяйсьняецца на нашых вачох... Сьледам за ўдарамі па сацыяльных радыкалах пасыпаліся ўдары па радыкалах нацыянальных!

Канфіскацыя „Нацыі“. У Варшаве выйшаў орган пад назовам „Нацыя“, друкаваны ў чатырох мовах—пабеларуску, паўкраінску, палітоўску і панямецку. Орган гэты меў асьвятляць палажэньне нацыянальных меншасьцяў у Польшчы. Па загаду польскіх уладаў, увесь наклад часопісі (4,000 экз.) сканфіскаваны паліцыяй.

Дзіўныя „візыты“. Жонкі арыштаваных беларускіх дзеячоў пачалі сустракаць каля дзьвярэй пракурора двух добра ведамых сярод беларусаў з самага благога боку тыпаў, паноў Яз. М. і Мак. К. Што гэныя тыпы маюць тамака да работы?!...

Узяліся за ксяндзоў-беларусаў! Пад той час, як пан Мэйштовіч „па-сталыпінску“ распраўляецца з „Грамадай“ і беларускімі радыкальнымі пасламі, — польскае каталіцкае духавенства—з багаслаўленьня „айца сьвятога“—узялося за „чыстку“ беларускіх каталіцкіх парахвіяў ад ксяндзоў-беларусаў, заменяючы апошніх — польскімі агітатарамі. Гэтак нованазначаны ў Вільню біскуп Ялбжыковскі, яры эндэк, які за рашучае дамаганьне правоў для беларускае мовы ў касьцелі проста выгнаў за дзьверы пасла Ярэміча, — цяпер выкінуў з Барадзеніч тамтэйшага пробашча кс. Шутовіча, ведамага беларускага дзеяча, і перавёў яго на ніжэйшае становішча вікарага ў Ліду.

Бадай адначасна ведамы ксёндз-радыкал Гадлеўскі з Жодзіскае парахвіі, засуджаны судом на два гады крэпасьці за беларускую агітацыю, адклікаены з Жодзішак і будзе адбываць сваю кару ў горадзенскім кляштары.

Ці паразуменьне—праз Вільню? Газэта „Zycie Ludu“ ў апошнім нумары падае вестку, што ў Вільню прыяжджаў з Рыгі англійскі пасол і вёў тутака нейкія перагаворы з сэкрэтаром англійскага пасольства ў Варшаве—ў справе пасрэдніцтва Англіі між Літвой і Польшчы—дзеля паразуменьня міжы імі. Апавядаюць, быццам госьць з Рыгі мае на гэта паўнамоцтва ад літоўскага фашыстаўскага ўраду.

Газэта паглядае на гэту вестку з сумлівам. Аднак, прымаючы пад увагу факт, што фашыстаўскі пераварот у Літве зроблены з дапамогай Англіі, якая сяньня мае вялікія ўплывы і на палітыкаў Польшчы, —

„Бунт палітычных вязьняў у Вялейцы“.

„Kur. Wil.“ у аўторкавым нумары з 15-га лютага друкуе пад гэткім загалоўкам вось гэтую вестку:

„9-га лютага ў 5 гадз. у вастрозе ў Вялейцы ўзьняліся бяз ніякае прычыны крыкі і сьпевы. Галоўнымі канаводамі былі вязьні Ян Палевіч і Вітаўт Лаўрыновіч.

„Вастрожны ўрад за кару хацеў пасадзіць у карцар Палевіча і Лаўрыновіча, але тыя супраціўіліся, а другія вязьні паднялі скандал. Дапамога ў сіле 8 душ, якую прыслаў паліцэйскі пастарунак, памагла завясьці названых вязьняў у карцар.

„Тады палітычныя вязьні ў ліку 11 пастанавілі зрабіць галадоўку. З гэтай мэтай стараліся завязаць сувязь з угалоўнымі вязьнямі, пускаючы запіскі на нітцы да ніжэйшых паверхаў. Вастрожны ўрад гэтую карэспандэнцыю перахапіў.

„Калі Палевіча і Лаўрыновіча засадзілі ў карцар, дык палітычныя вязьні адмовіліся прыняць ежу, трэбуючы звальненьня Палевіча і Лаўрыновіча.

„20-га лютага гэтыя-ж вязьні не далі разьвясьці сябе па іншых камарах, зказваючы пасыўнае спраціўленьне.

„Вастрожная ўлада паклікала дапамогу, і ў вастрог прыбыў афіцэр з 20-ма паліцыянтамі. Вязьні, бачучы паліцыю, ня ўпіраючыся далі вастрожнай варцэ перавясьці сябе ва іншых камараў. Трох найважнейшых вязьняў пасадзілі ў адзіночку“.

Падаем апісаньне выпадкаў у Вялейскім вастрозе цалком на адказнасьць польскае газэты.

афіцэра“?—спытаўся Ван-Тсун у свайго вучыцеля.

— „Ня мае права“ адказаў яму той. — „Наш імпэратар затрымліваць і судзіць белых ня сьмее“:

— „Няўжо кожны барадаты белы можа ў Кітаі навет забіць кітайца, і за гэта ён адказаваць ня будзе“?.. спытаўся ён ізноў у свайго вучыцеля.

— „Будзе, але яго будзе за гэта судзіць іхні суд, суд белых“ — адказаў неяк нехаця вучыцель.

— „Але-ж груган гругану вочы ня выдзяўбе“!?...

Вучыцель панура маўчаў на гэтае абурэньне хлопца, быццам баючыся зачапіць самае балючае месца сваей душы. Пазьней аднак ён расказаў хлопцу сумную гісторыю таго, як кітайцы на сваей уласнай зямлі апынуліся ў такой паняверцы ў барадатых белых прыблудаў.

— „Не, гэтак далей быць ня мома“... Чым мы горшыя за іх“?!.—крыкнуў хлопчык, выслухаўшы свайго вучыцеля. „Мы, кітайцы, павінны іх змусіць уважаць нас і на нашай зямлі шанаваць нашы законы“.

— „Пробавалі, ды неўдалося“,—адказаў на гэта вучыцель, — „хітрыя яны ўжо бяз меры“...

З гэтага дня Ван-Тсун быццам нарадзіўся. Ен ужо ня ўчыўся, каб ведаць на памяць розныя Шы-Кінгі і быць мандарынам-выканаўцам загадаў імпэратара. Мэта яго была іншая: ён шукаў розуму і хітрасьці, каб, стаўшыся разумнейшым і хітрэйшым за белых барадатых людзей, прагнаць іх з Кітаю і збавіць кітайскі народ ад зьдзеку чужынцаў.

Аднак, скора юнак Ван-Тсун пераканаўся, што, каб пазнаць усю хітрасьць белых, трэба пажыць з белымі ў іхняй зямлі, трэба паўчыцца разам з імі.

Праз неякісь час Ван-Тсун быў ужо ў Оксфордскім унівэрсытэце і дзень у дзень уважна, прагавіта слухаў сусьветную гісторыю, агульнае і міжнародавае права, палітычную эканомію, хімію, фізыку і іншыя навукі, падабраныя ў дзіўныя неякія групы і камбінацыі, што прафэсары толькі разводзілі рукамі.

— „Ня маеце ніякай сыстэмы“ гаварылі яны яму

Хлопец моўчкі і ўважна слухаў прафэсэрскіх уваг, але ў наступным сэмэстры паўтаралася зноў тое ж самае.

Праз гады тры Оксфорд аднак знудзіў Ван-Тсуна і ён апынуўся ў Бэрліне. З Берліна праз неякі час выехаў у Парыж, з Парыжа апынуўся аж у Нью Йорку.

Тут, у Амэрыцы, захапіла яго вайна. Фабрыкі застагналі і зараўлі, выкідываючы як дзень, так ноч цэлыя горы амуніцыі. Усюды чуўся недахват рабочых рук.

Ван-Тсун стаўся найлепшым работнікам парахавой фабрыкі і, дзякуючы ведзе, якую ён меў з хіміі і фізыкі, папаў навет у фабрычную лябараторыю.

Вечна занятага працай, вечна гатовага споўніць кожны загад свайго начальства, няласага да грошы Ван-Тсуна ўпадабалі нарэштку на заводзе ўсе басы, *) перад ім адкрыліся ўсе сэкрэты фабрыкацыі.

Ван-Тсун, аднак, не зьмяніўся: і пасьля гэтага ён астаўся на заводзе ціхім працавітым работнікам, вечна занятым працай.—На твару яго дарма б шукаў хто хоць цень сьмеху ці нядбальства.

Але на кватэры, запёршыся ў сваім невялічкім пакойчыку, Ван-Тсун быў зусім іншы. Тут вочы яго загараліся раптам дзіўным блескам, уся фігура выпрастоўвалася, раўнялася, пылала энэргіяй і нейкай становучай рашучасьцю.

— „Га, біцеся, біцеся“!.. гаварыў ён, ходзячы ўзад і ўперад па пакоі. — „Досыць вам згодна піць кроў і пот нашага народу!.. Пара, ох, пара нам скінуць вашае панаваньне“!..

Скора ўцягнулася ў вайну і Амэрыка. Цяпер ужо на вуліцах здароваму маладому мужчыне ня было праходу. Яго на кожным кроку лавілі вярбоўшчыкі і агітатары, стараючыся прыгожымі словамі і рознымі абяцанкамі заманіць у войска. Гаварылі тут і аб чэсьці новай бацькаўшчыны—Злучаных Амэрыканскіх Штатаў, і аб ворагу дзікім і нягодным, якога, у імя абароны культуры, трэба разьбіць і задушыць, вымазаць з сьвету.

Гаварылі і крычалі найбольш багатыя, тлустыя фабрыканты і іх адвакаты. Іхнія сыны заселі па ўсіх вярбовачных бюрах і па складах амуніцыі, а на фронт, дзе ўжо запраўды трэба было біцца і паміраць, ехала толькі бядота, якая жыве вечна з дня на дзень з крывавай сваей працы на фабрыках і ў вялікіх фармах, *) ды сваімі мазалямі напіхае кішэні крыклівых патрыётаў.

Сумна стала Ван-Тсуну.

— „Пэўна-ж і ў Нямеччыне робіцца гэтак сама“,—думаў ён сабе;—„багаты крычыць аб патрыятызьме, аб абавязку бараніць бацькаўшчыну і сядзіць у сваей фабрыцы, ці ў сваім двары, або ў штабе—за многа кілямэтраў ад бою... Калі-ж бядак адкажацца ісьці ў бой і ўцячэ з фронту, яго зловяць і расстраляюць, як здрадніка“.

І адкрыліся вочы Ван-Тсуна на новую праўду, сэрца яго забілася новаю верай — верай у працоўныя масы ўсяго сьвету і іхнюю колішнюю перамогу над культурнай дзікасьцю, над зьдзекам і вызыскам чалавека чалавекам.

Ван-Тсун сьмела ўзышоў на дарогу, па якой павінен ісьці працоўны люд усяго сьвету, і на душы яму стала радасна і весела.

Уважна і пільна пачаў ён цяпер прыглядацца да работніцкіх арганізацыяў і саюзаў, хадзіў навет на іхнія сходы, слухаў пільна і ўважна аратараў; аднак, скора ўсё гэта яму збрыдла: работніцкія саюзы і арганізацыі, якія ў пачатку вайны засталіся не зьліквідаванымі, былі то ў руках прадажнага фанатычнага духавенства, то аплачаваных буржуазіяй агентаў, якія аб тое толькі і стараліся, каб работнікі далей свайго носа нікуды не заглядалі; аб салідарнасьці працоўных мас ўсяго сьвету не гаварылася тут ні слова.

— „Кітай, Усход, прыходзіць твая чарга сказаць сваё слова ўсяму сьвету, і мы яго скажам“!.. ускрыківаў ён нярааз, ходзячы па сваім пакоіку.

Выпадкі ў сьвеце беглі адзін за адным, як увыперадкі: канца сусьветнай бойні ня было яшчэ відаць, а ў Расеі, войска якой у 1900 годзе найбольш памагло душыць паўстаньне „Вялікіх кулакоў“, *) загарэўся хатні пажар, і на прасторы шасьціны сушы ўсей зямной кулі запанаваў хаос.

— „Ашукаюць іх, здрадзяць, ізноў возьмуць у ярмо“!.. злаваўся Ван-Тсун, чытаючы ў газэтах аб розных думскіх, Карнілаўскіх і эс эраўскіх манэўрах і пераваротах.

Але ўсход Эўропы не паслухаў ані Карнілава, ані эс-эраў: у пахмурныя дні лістападу ён пад грохат гармат і трэск кулямётаў сам сабе выбраў дарогу.

— „Малайцы“!.. прагаварыў ціха Ван-Тсун, калі, ідучы на фабрыку, прачытаў у газэце аб новых выпадках у Расеі.

Ен з дзікай энэргіяй накінуўся цяпер на расейскую мову, каб, падвучыўшыся не хоць троху, кінуцца ў вір прабудженьня Усходу.

— — — — — — — — — — —

Лодка тымчасам падплыла да берагу і з ўсяго маху ўзсела на плыткі пяшчаны бераг, высока падыймаючы ўверх свой загнуты нос.

— „Скарэй, дружа, — нас могуць прымеціць подлыя слугі найміта белых“!—прагаварыў ціха храмы.

Ван-Тсун устаў і, падабраўшы полы свайго халату, пайшоў за храмым.

(Канец будзе).

*) Бас—старшы работнік, наглядчык, кіраўнік якогась аддзелу.

*) Двор—хутар.

*) „Вялікія кулакі“—кітайскія рэвалюцыянэры, ваяваўшыя за вызваленьне Кітаю ад зьдзеку эўрапэйцаў.

можна спадзявацца, што польскія і літоўскія фашысты папробуюць „паразумецца“.

Хвароба літоўскага дзеяча. Ведамы літоўскі адраджэнец, д-р Бассановіч, юбілей якога справуляла нядаўна літоўскае грамадзянства, — паважна захварэў на запаленьне лёгкіх. З увагі на век хворага (—75 гадоў!), палажэньне яго даволі цяжкае.

„Свабода“ для афэрыстаў. Паліцыя гэтак занята ўлаўленьнем „крамолы“, што ніяк ня можа ўлавіць афэрыста, які ня толькі выманіў у грам. Каўшовай грошы „на звальненьне мужа“, але надовячы зрабіў візыту і жонцы другога заарыштаванага беларускага дзеяча — грам. Астроўскага, якая жыве ў Каляёвай Калёніі. Афэрыст прадставіўся, як прадстаўнік пракуратуры, і заявіў, што праз некалькі гадзін грам. Астроўскі будзе звольнены. Зразумеўшы з адказу грам. Астроўскай, што яна раскусіла нягодніка, афэрыст уцёк.

Ходзяць чуткі, быццам афэрыст адведаў і архіепіскапа Хвядоса, у якога хацеў выманіць 100 злот. нібы-то за звальненьне сьв. Каўша.

Паводле апісаньня бачыўшых яго жонак арыштаваных беларусаў, ён — высокі блёндын, з рабаватым тварам. На грудзёх меў пракурорскую істужку з польскім дзяржаўным гэрбам.

Перасьцерагаем сем'і нашых арыштавадзеячоў на правінцыі, каб не далі сябе ашукаць надобным афэрыстам, каторыя лёгка могуць перакінуць сваю дзеяльнасьць на вёску.

Афіцыяльны курс грошы на 15 лютага. Даляр — 8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 58 гр.

15./II. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,96. Зал. р. 4,70 Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Падзякі.

Маладэчанскі Павятовы Камітэт Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады шле шчырую падзяку ўсім ніжэй паданым за ахвяры, зложаныя для сяброў адбываючых адміністрацыйныя кары: Бухаўскаму гуртку Бел. Сялян.-Работ. Грамады за 8 кілё сала, 2½ кілё каўбасы і 5 зл. 90 гр., грашыма: Зясьценскаму гуртку, Лебедзеўскае гм., за 11 зл. 15 гр., Гуртку ў в. Канчані, Красасельскае гм., за 10 зл. 80 гр., Ваўкоўскаму гуртку, Красьнянскае гм., за 6 зл. 30 гр., Грамадзянам вёскі Пісарвўшчына, Красьнянскае гм., за 1 зл. 75 гр., Крыніцкаму гуртку, Маладэчанскае гм., за 3 зл. 40 гр., Мусяцінкаму гуртку, Красносельскае гм., за 3 зл. 5 гр., Мароськаўскаму гуртку, Лебедзеўскае гм., за 14 зл. 30 гр., грашыма, 6½ фун. каўбас і 5 фун. сала, Гурновіцкаму гуртку за 3 зл., 10 гр., Гуртку ў Дравашах за 12 зл. 30 гр., Енімахоўскаму гуртку за 2 зл., Сівіцкаму гуртку за 7 зл. 40 гр., Даўгалагоўскаму гуртку за 3 зл. 85 гр. Усе тут успомненыя ахвяры будуць адасланы пацярпеўшым ад адміністрацыйных караў.

Сасноўскі Гурток Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады шле шчырую падзяку сялянам вёскі Сасноўкі, Дзевяткаўскае гміны, Слонімскага павету за ахвяру грашыма на палітычных вязьняў у ліку 11 зл. 50 гр.

Карэспандэнцыі.

Народны Дом і бібліатэка-чытальня.

(в. Пяшчаньнікі, Беластоцкага пав.).

Галоўнаю Управаю Т-ва Беларускае Школы ў Вільні адчынены Народны Дом і бібліатэка-чытальня. Кожны вечар зьбіраецца да 50 асоб, каб пачытаць, або паслухаць якуюсь цікавую кніжку ці газэту. Культурная праца не абмінае і дзяцей. Каб даць ім магчымасьць вучыцца ў роднай мове, сяляне выпісалі з беларускае кнігарні падручнікаў і на кожных 3—5 дзяцей прыходзіць граматнейшы сябра і памагае ім вучыцца.

Грамадзяне! Бярыце прыклад з Пяшчанкаўцаў.

Спэктакль.

(в. Шылькі, Ваўкавыская гм., Пастаўск. пав.).

2-га студзеня 1927 г. у маім доме і пад маім кіраўніцтвам, як адказнай асобы, зладжаны быў спэктакль. Адыграна была вясковая камэдыя „Выбары Старшыні“ у 3-х дзеях і жарт у адным акце „Зьбянтэжаны Саўка“. Ігралі ажно тры разы пад рад з тае прычыны, што народу было многа, а памяшчэньне цеснае. Артысты нашы, узяўшы пад увагу тое, што выступалі першы раз на сцэне, ігралі добра, публіка была на'т здаволеная, асабліва, калі адыгрываўся жарт „Зьбянтэжаны Саўка“. Многа хто гаварыў „мы не спадзяваліся, што ў вашых артыстаў гэтак гладка выйдзе“. Навет паліцыянты, каторыя былі на спэктаклі, гаварылі: „чы то артысьці вшысцы вёсковэ? Так добжэ граён!“. І нашыя паўпанкі, падлізьнікі панскія, (іх у нас дзякаваць Богу ёсьць як груганьня), каторыя насьмейваліся і гаварылі, што нічога ў нас ня выйдзе нічога нясумеем зрабіць, цяпер пасьля спэктаклю паспускалі насы, раптам заціхло, хоць можа і не надоўга, бо трэба па іх спадзявацца, што ізноў пачнуць сваю зьвягу, як тыя сабакі!.

Але нас яны не запалохаюць, мы не баімося іхняй пустой зьвягі, няхай сабе брэшуць, аж трэснуць, а мы сваё будзем рабіць, будзем змагацца з усякай перашкодай, стаўленай нам на кожным кроку з тэй надзеяй, што раней ці пазьней дойдзем да лепшае будучыны.

Даходу з прадажы білетаў атрымана 129 зл. 20 грош. Расходавана: 1) на дазвол старасты, штэмплёвай і паштовай аплаты — 14 зл.; 2) 10 проц. ад прадажы білетаў унесена на мэты Т-ва дабравольнае пажарнае стражы пры Ваўкалацкай гміне; 3) на ўсю дэкарацыю і на іншыя тэатральныя прылады расходавана — 44 зл. 8 гр. Агулам:—71 зл. Частку з даходу ад прадажы білетаў паслана, як сяброўская складка, у Галоўную Управу Т-ва Белар. Школы за сяброў: Мацюшонка Язэпа, Шылькі Аляксандра, Шылькі Паўла, Шылькі Пётры, Літвіна Язэпа і Шылькі Уладыслава за 3 месяцы: кастрычнік, лістапад і сьнежань—9 зл., і за сяброў: Шылькі Уладыслава с. Міхала, Шылькі Міхала, Шылькі Пётры с. Станіслава, Шылькі Ігнася, Кушаля Станіслава, Шылькі Яна с. Зыдора, Шылькі Вінцука, Кушаля Сымона, Шылькі Яна с. Кароля, Шылькі Антона с. Кароля, Шылькі Антона с. Яна і Бабровіча Яна, як сяброўскія складкі за месяц сьнежань—6 зл. За 1926 год, агулам пасылаю—15 зл.

А. Шылька, часовы кіраўнік Гуртка Т-ва Бел. Школы ў в. Шылькі.

Культурная праца пашыраецца.

(Баранавіцкі пав.).

Кудзевіцкі Гурток Т-ва Белар. Школы ў в. Кудзевічах, 14/I 1927 г. а гадз. 14-тай, у доме грам. Васіля Шылоўскага ладзіў вечарыну. Праграма была наступная: 1) Азнаямленьне з гісторыяй Беларусі. I. Што такое гісторыя? 2) Дэклямаваньне вершаў, 3) Пяяньне хорам, 4) Скокі.

Вечарына пачалася ў прысутнасьці прадстаўніка ўлады. Прысутных было каля 100 асоб. Даклад на тэму: „Што такое гісторыя“?—зрабіў грам. Кастусь Галубовіч. Пасьля адзін за адным выступалі сяляне і дэклямавалі вершы. Сябра Т-ва Белар. Школы Сьцяпан Шэйна прадэклямаваў наступныя вершы: „Край ты мой родны!“ (Дэкляматар). „У цішыні“—Салагуба. „Ігрышча“ (Маланка). Грам. Аляксандра Шэйна — „Страшны суд“ (Студ. Думка). Грам. Рыгор Камар — „Зьняважыў“ (Маланка) і грам. Кастусь Галубовіч — „Абразкі“ (прозай, з дэкляматару). Далей спэцыяльна вызначаны хор сьпяяў дзьве песьні: „Ой верба, верба...“ і „Марак“. Пасьля гэтага пачаліся скокі, якія трывалі да 1 гадз. А гадз. 8-й у доме Ігнася Бакача сабралася 50 асоб на вечарыну, якая была наладжана за дабравольныя складкі грамадзян. На вячэру былі пакліканы бяднейшыя грамадзяне, каторыя з прычыны беднасьці не маглі з радасьцю спаткаць Новага Году. Вячэра прайшла вельмі весела.

Зазначаем, што ўся апісаная вышэй вечарына мела на мэце даць магчымасьць вясковым сялянам выяўляць сваю ініцыятыву, прывучыць да выступленьняў і, апрача гэтага, спаяць усіх у адну сям'ю і зьнішчыць розныя дробныя непаразуменьні паміж паасобнымі грамадзянамі.

Вечарынай сяляне былі вельмі зацікаўлены. Доказам гэтага можа служыць тое, што сяляне жадаюць, каб гэткія вечарыны рабіліся як найчасьцей.

Шчырая адміністрацыя ня хоча дапусьціць беларускіх газэт на вёску.

(Пінскі павет).

Адміністрацыя Лемешавіцкай гміны, Пінскага павету разам з камаадантам паліцыі затрымлівала ўсе беларускія газэты, пачынаючы з 15 лістападу, у працягу больш як 2 месяцаў. Калі я некалькі разаў зьвяртаўся да паштовага чыноўніка Лемешавіцкай пошты з пытаньнем, ці ёсьць якая карэспандэнцыя або газэты—то ён заўсёды адказываў, што ні газэт ні карэспандэнцыі няма. Усе надпішчыкі, а разам з імі і я думалі, што ўсе беларускія газэты зачынены. Аж-но 4/1 быў я ў м. Пінску і даведаўся, што беларускія газэты выходзяць і надалей, а толькі мы іх не атрымоўваем. Тут-жа мне ўдалося атрымаць некалькі нумараў газэт. Пасьля гэтага я пашоў на сваю пошту і настойчыва спытаўся ў чыноўніцы, чаму не выдаюць адрэсатам беларускіх газэт. Яна мне адказала, што ўсе беларускія газэты забірае Камандант пастарунку. Тады я зьвярнуўся да Каманданта пастарунку і спытаў яго, чаму ён у працягу двух з палавінай месяцаў затрымлівае карэспандэнцыю і ўсе беларускія газэты. Але ён мне рассеяна адказаў, што ніякай карэспандэнцыі беларускае Грамады і беларускіх газэт ня меў і ня мае. Ад гэтуль я накіраваўся ў гміну, дзье на мае дамаганьніх быў выданы № 11 „Нашай Справы“. Сьведкам усяго гэтага быў грамадзянін Сьцяпан Сапялевіч з вёскі Плешчыцы, Лемешавіцкае гміны, Пінскага павету.

Зьмітрук Каллаўр.

Вобыскі ў вёсцы.

(З Крынскае гміны).

15.I 1927 году зьявіўся камандант Крынскага пастарунку з паліцыянтам у вёску Кудрычы і зрабіў вобыск у грамадзіста Якуба Савіцкага, які актыўна працуе ў арганізаваньні гурткоў Грамады. Савіцкага на той час ня было дома, а была толькі яго старая 60 гадоў маці; але, не зважаючы на гэта, „dzielny komendant“ перарыў усю гаспадарку Савіцкага, шукаючы нелегальнай літэратуры і аружжа. Зразумела, нічога не знайшлі. Вобыск трываў некалькі гадзін і праз увесь час гэтай беднае кабеты не выпускалі з памешканьня. Калі зьявіўся Савіцкі, то застаў матку паўжывую з перапуду і чуць дапытаўся, што гэта сталася. Тады пашоў да солтыса, дзе і застаў паліцэйскіх. Камандант тутжа прыняўся пісаць пратакол рэвізіі, а паліцыянт давай гаварыць Савіцкаму: „Ostrzegam pana Sawickiego, że działalność na gruncie organizowania hurtków doprowadzi bezzwłocznie do więzienia“. У адказ Савіцкі сказаў, што ніякія пастрахі яму ня страшныя і ня спыняць яго ў легальнай працы на карысьць свайго народу.

Аднадумец.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ.

Прэзыдыум Беластоцкага Павятовага К-ту Бел. Сял.-Раб. Грамады просіць выбраных у пленум сяброў прыбыць у памяшчэньне Камітэту (Беласток, Вітэбская вул. 12) 20-га лютага ў 11 гадз. раніцы.

Старшыня: (—) **М. Грыцук.**

Сэкрэтар: (—) **К. Сідаровіч.**

Сьледам за дзедам, ці за панамі поўпанак.

(З Гарадзцкае гміны).

Да абшарніцы двара Доўцэвічы, Гарадзцкае гміны, Барсуковай прышоў гадоў пяць назад у прымы Кукелеўскі шляхцюк, Мячыслаў Шымкевіч, і вельмі скора зрабіўся прыкладным панам, бо добра ўмее зьдзекавацца над сваей дворняй. Калі ня так даўно ён заўважыў, што ў шафе паменшала сьмятаны (пэўняком зьлізаў), пазваў у пакой дзьвюх сваіх дзяўчат і з браўнінгам у руках грэзіў іх застраліць за тое, што ўкралі сьмятану. У бедных і блохі падохлі... Дзе там перад такой гразой было апраўдавацца! Трэба было з поўгадзіны, аж пакуль не адлягло поўпанку, выслухваючы самую паскудную лаянку і стоючы на каленях, прасіць аб памілаваньні. Дзіву даецца чалавек, шляхцюкі забываюцца аб сваей прошласьці і адносяцца да роўных сабе нядаўна людзей горэй за запраўдных паноў, забываючыся саўсім праўдзівае прыказкі: „Адальюцца ваўку авечыя сьлёзкі“.

Зорка.

Нам пішуць з вескі што:

× Грамадзяне вёскі Рэўкі, жадаючы адчыніць у сваей вёсцы бібліатэку зрабілі ў часе калядных сьвят збор ахвяр на бібліатэку з каляднаю зоркаю па сваей і суседніх вёсках.

Справа гэта ім ўдалася вельмі добра, бо сабралі яны больш за 50 зл., на якія безадкладна выпісываюць кніжкі для бібліатэкі. Усім грамадзянам складаўшым ахвяры на бібліатэку, грамадзяне вёскі Рэўкі пасылаюць шчырую падзяку.

× Паліцыянты з пастарунку Вяліка-Эйсмантаўскае гміны, 18 студзеня г. г. прышлі ў вёску Рымуцяўцы і пачалі рабіць вобыск у грам. Янкі Нялепкі. Паліцыянт № 151 зьвярнуўся да Янкі Нялепкі з трэбаваньнем аддаць камуністычную літэратуру. Вобыск ня даў жадных вынікаў, нічога зразумела не знашлі. Тады камандант зьвярнуўся да Янкі Нялепкі, каб той паставіў тры бутэлькі гарэлкі, што ўсе разам вып'юць і ня будуць рабіць ніякіх пратаколаў. Але прайшлі ўжо тыя часы, калі нашых сялян так лёгка было занужаць і узяць з іх, што хочаш, няма дурняў. Дык і Янка Нялепка, зразумела, нічога ня даў і пашлі сабе паліцыянты аблізаўшыся.

× Хлопцы грамадзісты з вёскі Зарудзічы і Сівіцы займаюцца непатрэбнымі а навет шкоднымі справамі, бо носяцца з думкамі, каб пабіць каго не-будзь. Так у нядзелю 6 лютага яны зьявіліся на вясельле ў вёску Яневічы і пачалі рабіць аблаву з коламі ў руках на аднаго зарудзіцкага дзяцюка. Бедны хлапец мусіў увесь час пратаўчыся ў запечку. Відаць, успомненыя хлапцы ня відзяць лепшае і карысьнейшае работы.

× Поп з м. Турца, Стаўпецкага пав., Язэп Тумілевіч дзярэ з бедных сялян шкуру. Так у нядзелю 6 лютага гэты поп зажадаў ад маладой пары, якая прыехала вянчацца 15 рублёў золатам за шлюб. Малады, ня маючы такой сумы, згаджаўся залажыць у царкве сваю вопратку, але поп ня прыняў. Толькі знаёмы жыд, калі даведаўся, у чым справа, пазычыў патрэбную суму грошы. Дзякуючы гэтаму толькі маладая пара змагла ўзяць шлюб.

Весткі з Латвії.

Водгукі арыштаў беларусаў у Польшчы.

Латвійская прэса горача і спагадна да беларусаў адгукнулася на арышты беларускіх паслоў і грамадзкіх дзеячоў пад Польшчай.

Сацыял-дэмакратычная газэта „Socialdemokratas“ перадрукавала цалком перадавіцу „Нашае Справы“, дзе было запярэчаньне брахлівых інфармацыяў прэсы аб дзеяльнасьці беларускіх паслоў-грамадаўцаў і беларускіх культурных установаў, ды дадзена праўдзівае асьвятленьне ўсяе афэры. Ды ня толькі сацыял-дэмакраты, але і нацыяналісты рашуча асудзілі ўрадавую акцыю проці беларусаў. Гэтак орган латышскіх нацыяналістаў „Latwis“ у нумары з 6 лютага востра выступае проці мін. Мэйштовіча, раўнуючы сучасную палітыку Польшчы ў адносінах да беларусаў—з палітыкай старога царскага ўраду ў Расеі. У канцы стацьці гаворыцца:

„Разумная ўлада зьвярнула-б увагу на абаснаваныя беларускія патрэбы і правы і такім чынам прывязала б беларусаў да Польшчы. Але польская ўлада пры дапамозе правакацыі стараецца зрабіць беларускую нацыянальную арганізацыю „Грамаду“ за камуністычную і арыштавала яе дэпутатаў і іншых павадыроў. Гэтымі сродкамі дружбу ні аднаго народу атрымаць немагчыма, і таму ўсім запраўдным прыяцелям Польшчы патрэбна пажадаць, каб польская ўлада зьмяніла сваю расейскую палітыку да сваіх меншасьцяў і асабліва да беларусаў“.

Кіраўнік беларускага аддзелу ў мін. асьветы.

Доўгі час беларускі аддзел у міністэрстве асьветы ня меў свайго кіраўніка. Фармальна ім кіраваў сам міністар асьветы, мала знаёмы з беларускімі справамі і патрэбамі,—дык і беларуская школьная справа ў Латвіі за апошнія гады шмат падупала. — Толькі надовячы новы латвійскі ўрад (сацыял-дэмакратычны) назначыў за кіраўніка аддзелу беларускага грамадзкага дзеяча грам. Уладзімера Пігулеўскага.

Трэба спадзявацца, што ўрэшце беларуская школьная справа ў Латвіі скранецца з мёртвага пункту, на якім яна апынулася ад часу скандальнага працэсу, сфабрыкаванага латвійскай дэфэнзывай проці галоўных беларускіх культурных дзеячоў у Латвіі. Хаця суд усіх абвінавачаных апраўдаў, аднак-жа ўрад ня даў ім магчымасьці далей вясьці наладжаную роботу, і яны былі прымушаны або пакінуць межы Латвіі і перабрацца заграніцу (ў Менск), або адыйсьці ад асьветнае работы.

Гожа адзначыць учасьце ў сфабрыкаваньні беларускага працэсу ў Латвіі... польскагага дэпутага ў латвійскім сойме! Цяпер, здаецца, польскія ўплывы ў Латвіі крыху паменшалі...

Паштовая скрынка.

Віктару Цямошыку: Вашай карэспандэнцыі не зьмяшчаем, бо нічога ў ей цікавага няма. — **Міхасю Волату:** Вершаў Вашых не друкуем, бо надта вострыя яны. — **Дзеду Ігнату і Унуку Барысу:** Зьмясьціць ня можам, занадта востра. Пішыце лепш прозай. — **Р. Зенкевічу:** Пішыце ясьней і разборчывей. — **Сярмяжніку:** З прысланага выкарыстоўваем толькі частку, з астальным пачакайце.

ВЯЛЕЙСКАЯ АКРУЖНАЯ УПРАВА гэтым просіць гурткі Т-ва Беларускае Школы, а таксама і сяброў Т-ва аб прысылцы 50% адлічкі ад сяброўскіх складак.

Каб ня было перабояў у працы павятовай культурнай Установы, якая кіруець усей працай у павеце, — усе сябры Т-ва павінны выпаўніць свой сяброўскі абавязак і ўнясьці складку.

Акружная Управа таксама прызываець сяброў да культурна асьветнай працы ў усіх яе галінах. Закладайце гурткі Т-ва, закладайце Народныя Дамы і бібліатэкі чытальні, ды прыватныя беларускія школы, у якіх будуць узгадовывацца будучыя барацьбіты за лепшую будучыню.

Вялейская Акружная Управа
Т-ва Белар. Школы.

Рэдактар Выдавец: Альберт Эйсак.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.